# ШЛЯХІ ЎДАСКАНАЛЬВАННЯ ЗМЕСТУ ЭКАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ПЕДАГАГІЧНЫМ КАЛЕДЖЫ

373.4+
372.011.7

***А. Р. БАРЫСЕВІЧ,***
***асістэнт кафедры педагогікі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка***

На працягу апошніх дзесяці гадоў нарастае працэс разбурэння поглядаў, уяўленняў і стэрэатыпаў, якія склаліся ў прафесіянальнай адукацыі. Адначасова ідзе інтэнсіўны пошук новых спосабаў функцыяніравання і развіцця педагагічных навучальных устаноў, шляхоў змянення матывацыі педагагічнай дзейнасці і атрымання прафесіі, адносін паміж педагогамі і навучэнцамі. У гэтых умовах асаблівае значэнне мае распрацоўка ключавых інтэгратыўных катэгорый, з якіх фарміруецца новы светапогляд у сферы адукацыі.

У рамках уяўленняў аб прафесіянальнай дзейнасці да такіх катэгорый адносяцца паняцці «экагуманітарная адукацыйная парадыгма», «эколага-педагагічная адукацыя і выхаванне», якія набываюць сёння некалькі іншы сэнс, што адлюстроўвае новыя з'явы ў жыцці людзей. Значнасць распрацоўкі іх сутнасці і зместу ўзрастае ў сувязі з сучасным станам экалагічнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Яе можна ахарактарызаваць як своеасаблівы рубеж, на якім узнікла неабходнасць змянення тыпу экалагічнай свядомасці і мыслення людзей, іх светаўспрымання.

У навуцы ўсё большую актуальнасць набывае палажэнне аб тым, што экалагічны крызіс — гэта перш за ўсё крызіс свядомасці чалавека, і чалавецтва зможа адолець глабальныя экалагічныя праблемы, толькі змяніўшы сваю свядомасць і перагледзеўшы адносіны да прыроды (С. М. Глазачаў, І. Дз. Звераў, М. М. Маісееў).

Глабальны характар сучасных экалагічных праблем абумовіў патрэбнасць у пераарыентацыі сістэмы адукацыі на новую стратэгію засваення каштоўнасцей і фарміравання на гэтай аснове экалагічнай культуры асобы, накіраванай на гарманізацыю адносін чалавека з прыродай.

У апошнія гады намецілася тэндэнцыя да ўзаемадзеяння эколагаў, педагогаў, псіхолагаў і сацыёлагаў у даследаванні педагагічных праблем. У выніку сфармулявана новая экалагічная парадыгма.

Накладанне «палёў» новай экалагічнай парадыгмы светапогляду і новай адукацыйнай парадыгмы ўтварае «поле» экалагічнай адукацыі і выхавання, фарміравання экалагічнай культуры асобы. Узнікае новы напрамак — экалагічная псіхапедагогіка, мэтай якой з'яўляецца фарміраванне экалагічнай асобы. У сацыякультурным працэсе, адукацыйных сістэмах, дзейнасці настаўніка з'явілася і актуалізуецца функцыя — падтрыманне ў асобе, грамадстве каштоўнасцей новай экагуманітарнай культуры, цэласнага светапогляду, які адэкватна адлюстроўвае месца чалавека ў сістэме «прырода — грамадства — чалавек».

У лік прафесіянальных задач будучых настаўнікаў уваходзіць падрыхтоўка школьнікаў да асэнсавання глабальных і лакальных экалагічных праблем і шляхоў іх практычнага вырашэння. Сучасная экалагічная адукацыя патрабуе адэкватнай падрыхтоўкі настаўніка.

Педагагічная практыка пацвярджае выказваемую многімі вучонымі думку аб тым, што ўзровень экалагічнай адукацыі ў сённяшняй школе застаецца нізкім (М. В. Гнілуша, І. Дз. Звераў, А. І. Захлебны, Т. Р. Каленнікава, А. У. Міронаў, І. Т. Суравегіна і інш.). Апошняе сцверджанне адносіцца і да ацэнкі ўзроўню экалагічнай свядомасці асобы, і перш за ўсё настаўніка.

Антрапацэнтрычны тып экалагічнай свядомасці як сістэма ўяўленняў аб свеце, для якой характэрны проціпастаўленне чалавека (як вышэйшай каштоўнасці) прыродзе (як яго ўласнасці), успрыманне прыроды як аб'екта аднабаковага ўздзеяння чалавека, прагматычны характар матываў і мэт узаемадзеяння з ёй, што пранізвае ўсе сферы яго дзейнасці, у тым ліку і адукацыйную, праіснаваўшы на працягу некалькіх стагоддзяў, уваходзіць у супярэчнасць з новым тыпам экалагічнай свядомасці і новым бачаннем свету, неабходных для пераадолення экалагічнага крызісу.

Экацэнтрычны тып экалагічнай свядомасці, што базіруецца на новай «экацэнтрычнай» парадыгме, разумеецца як сістэма ўяўленняў аб свеце, для якой характэрны арыентаванасць на экалагічную мэтазгоднасць, адсутнасць проціпастаўлення чалавека і прыроды, успрыманне прыродных аб'ектаў у якасці паўнапраўных суб'ектаў і партнёраў па ўзаемадзеянню, баланс прагматычнага і непрагматычнага ўзаемадзеяння з прыродай [7].

Аснову новай стратэгіі адукацыі складаюць прынцыпы гуманізацыі і экалагізацыі яе зместу і арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу. Сутнасць названых прынцыпаў заключаецца ў пераходзе ад аналізу асобна разглядаемых з'яў і працэсаў, і перш за ўсё чалавека, яго

патрэбнасцей, інтарэсаў, да аналізу з'яў як сістэмы, уключанай у болын буйную сістэму — у трыяду «прырода — грамадства — чалавек», да вывучэння педагагічных з'яў у іх узаемазвязанасці, узаемазалежнасці і ўзаемапранікненні.

Экагуманізацыя адукацыі змяняе характар адукацыйнага працэсу шляхам гарманізацыі, удасканальвання сувязей паміж яго элементамі (прадметамі), этапамі (ступенямі), галоўнымі дзеючымі асобамі — настаўнікам і вучнямі.

Феномен экалагічнага выступае ў гуманістычнай адукацыі як «дыдактычны феномен» праз уключэнне інфармацыі экалагічнага зместу, якаснае пераўтварэнне пазнавальнай дзейнасці, пазіцыі суб'екта ў гэтым працэсе, ставіць пытанне аб неабходнасці фарміравання педагога як экалагічнай асобы, для якой экалагічная накіраванасць з'ўляецца стрыжнёвым кампанентам агульнай накіраванасці, што мае на ўвазе наяўнасць сістэмы матываў, мэт, каштоўнасных арыентацый і ўстановак у адносінах да прыроды і грамадства. Толькі настаўнік, які ўяўляе экалагічную асобу, здольны выхаваць вучня з экацэнтрычным тыпам мыслення.

У сваім даследаванні эколага-педагагічную накіраванасць асобы настаўніка мы вызначаем як прафесіянальна значную якасць, што абумоўлівае сістэму яго каштоўнасных адносін да прыроды, грамадства, дзяцей, сябе, якія задаюць іерархічную структуру дамінуючых матываў у педагагічнай дзейнасці і зносінах.




Такім чынам, як вынікае з аналізу зместу прыведзенай схемы, у сістэме каштоўнасных адносін да прыроды сістэмаўтваральным элементам выступае яе ўспрыманне як вышэйшай жыццёвай каштоўнасці і сродку выхавання, у сістэме адносін да дзяцей — яго ацэнка як элемента прыроды і суб'екта навучальна-выхаваўчага працэсу, у сістэме адносін да сябе — усведамленне сябе як часткі прыроды і арганізатара эколага-педагагічнай дзейнасці.

Эколага-педагагічная накіраванасць, з'яўляючыся цэласнай і комплекснай характарыстыкай, канцэнтруе тры ўзроўні сувязей і адносін.

1. Сувязі, якія адлюстроўваюць мінулае. Адносіны да прыроды, дзяцей, сябе, назапашаныя чалавекам у працэсе яго станаўлення.

2. Сувязі, што рэпрэзентуюць сучаснасць. На гэтым узроўні каштоўнасныя адносіны асобы актуалізуюцца і рэалізуюцца на практыцы.

3. Сувязі, арыентаваныя на будучыню. Адносіны гэтага ўзроўню змяшчаюць у сабе патэнцыял будучага развіцця.

Мнагамернасць сувязей і адносін, якая характарызуе ўзаемапераход структурных элементаў эколага-педагагічнай накіраванасці з віртуальнага стану ў актуальны, адлюстроўвае ўласцівую ўсякаму роду дзейнасці дыялектыку. Менавіта таму мы разглядаем эколага-педагагічную накіраванасць у якасці сістэмаўтваральнай асновы патэнцыялу асобы настаўніка.

Вядучымі паказчыкамі эколага-педагагічнай накіраванасці будучых настаўнікаў выступаюць: перакананасць у неабходнасці захавання прыроды як вышэйшай каштоўнасці жыцця і сродку выхавання; валоданне светапогляднымі экалагічнымі ідэямі і паняццямі і іх сацыяльна-педагагічнымі аспектамі; цікавасць да прыроды і дзіцяці як да яе часткі; сфарміраванасць суб'ектнага вопыту паводзін у прыродзе, усведамленне неабходнасці экалагічнага выхавання вучняў.

У ходзе праведзенага намі даследавання эколага-педагагічнай накіраванасці навучэнцаў I курса педагагічнага каледжа атрыманы наступныя вынікі. На неабходнасць захавання прыроды ўказваюць 37 % апытаных, каштоўнасць якой разумеецца імі ўтылітарна («карысць для людзей», «спосаб існавання», «бясплатнае дабро»). Як самакаштоўнасць успрымаюць прыроду толькі 6 % рэспандэнтаў («крыніца радасці, натхнення», «крыніца жыццёвых сіл», «крыніца жыцця»). І толькі адзінкі бачаць у прыродзе сродак выхавання чалавека (дзіцяці). Паказальна таксама, што суадносіны тых, хто лічыць, што «чалавек кіруе прыродай», і тых, хто лічыць, што «чалавек кіруе не прыродай, а сабой у прыродзе», складаюць 3 : 1.

Сярод светапоглядных экалагічных ідэй і паняццяў на першае месца па значнасці апытання ставяць ідэі аб вядучай ролі чалавека ў захаванні ўсіх форм жыцця на Зямлі (58 %), здароўі як універсальнай каштоўнасці жыцця (56 %), прыродзе як крыніцы асобаснага і прафесіянальнага ўдасканальвання (48 %).

Устойлівую пазнавальную цікавасць да прыроды і дзіцяці, эколага-педагагічных праблем выявіў 31 % навучэнцаў. Большасць апытаных (42 %) маюць няўстойлівую цікавасць да прыроды і дзіцяці як яе часткі — часцей эмацыянальную, чым пазнавальную.

У нашым даследаванні 48 % рэспандэнтаў не маюць крытычных адносін да сваіх паводзін

і паводзін іншых людзей у прыродзе, 41 % крытычна адносяцца да іншых, але не да сябе ў аналагічных сітуацыях. Веданне агульных правілаў паводзін у прыродзе выяўляе большасць апытаных пры адначасовай несфарміраванасці суб'ектнага вопыту паводзін.

Значная частка навучэнцаў лічыць, што экалагічным выхаваннем дзяцей павінны займацца дзяржава, грамадства, людзі, а за яго вынікі нясе адказнасць грамадства, а не педагог (39 %). 44 % навучэнцаў усведамляюць неабходнасць ажыццяўлення настаўнікам экалагічнага выхавання школьнікаў, але лічаць, што адказнасць за яго вынікі павінны несці іншыя. І толькі 17 % падзяляюць пункт гледжання аб адказнасці настаўніка за вынікі экалагічнага выхавання.

Вынікі анкетавання сведчаць, што першакурснікі слаба арыентуюцца ў экалагічных праблемах. Веды, атрыманыя ў школе, аказаліся недастатковымі, і большая частка вучняў засвоіла іх на рэпрадуктыўным узроўні.

Падсумоўваючы вышэйпрыведзеныя вынікі даследавання, зазначым, што дынаміка развіцця эколага-педагагічнай накіраванасці асобы навучэнца педкаледжа залежыць ад вырашэння супрацьлегласцей паміж станам грамадскай свядомасці (антрапацэнтрычнай свядомасцю) і новымі адносінамі чалавека з прыродай (экацэнтрычнай свядомасцю), макраасяроддзя і асобы будучага педагога, умовамі, якія вызначаюць аптымізацыю працэсу эколага-педагагічнага станаўлення будучага настаўніка, і яго гатоўнасцю да ажыццяўлення экалагічнага выхавання малодшых школьнікаў.

Назавём шэраг крытычных момантаў, якія вызначаюць межы якаснага пераходу ў працэсе фарміравання эколага-педагагічнай накіраванасці будучага настаўніка. Да іх мы аднеслі:

— паступленне ў педагагічны каледж (узровень агульнага экалагічнага развіцця);

— вывучэнне эколага-педагагічных ідэй і праблем у працэсе авалодання педагагічнай прафесіяй (узровень развіцця эколага-педагагічнай цікавасці);

— завяршэнне спецыяльнай педагагічнай адукацыі ў каледжы (узровень развіцця эколага-педагагічнага мыслення);

— прафесіянальнае самасцвярджэнне ў навучальна-выхаваўчай рабоце з класам (узровень практычнай рэалізацыі экалагічнай накіраванасці асобы настаўніка).

Працэс станаўлення эколага-педагагічнай накіраванасці асобы будучага настаўніка здзяйсняецца ў пэўных часавых і прасторавых рамках, паколькі выбар жыццёвага шляху, самавызначэнне асобы ў сістэме «прырода — грамадства — чалавек» у многім адбудзецца да моманту пачатку навучання ў каледжы. Да таго ж каледж з'яўляецца для будучага настаўніка цэнтрам соцыуму, у якім ён жыве і дзейнічае ў надзвычай важны перыяд свайго жыцця — перыяд сталення і самавызначэння. Такое разуменне працэсу станаўлення экалагічнай асобы будучага настаўніка мае на ўвазе вылучэнне наступных напрамкаў навучальна-выхаваўчай дзейнасці педагагічных каледжаў:

— выяўленне магчымасцей адукацыйнай сферы педагагічнага каледжа ў стварэнні ўмоў, якія садзейнічаюць фарміраванню эколага-педагагічнай накіраванасці будучага настаўніка;

— вызначэнне каштоўнаснага напаўнення зместу адукацыі і выхавання, што садзейнічае фарміраванню ўстойлівай накіраванасці асобы будучага настаўніка;

— абазначэнне вядучых ідэй і паняццяў, на якіх інтэгруецца змест адукацыі і забяспечваецца яго экалагічная накіраванасць;

— рэалізацыя магчымасцей педагагічнага каледжа як эколага-педагагічнага мікрасоцыуму, што садзейнічае станаўленню эколага-педагагічнай накіраванасці асобы будучага настаўніка.

**Літаратура**


1. **Абульханова-Славская К. А.** Стратегия жизни. М.: Мысль, 1991.
2. **Борисевич А. Р.** Возможности курса педагогики в формировании экологической направленности учащихся педагогического колледжа // Адукацыя і выхаванне. 1997. № 5. С. 67—70.
3. **Борисевич А. Р.** Проектирование учебной деятельности в системе научных представлений Л. С. Выготского // Матэр. рэсп. студ. навук.-практ. канф., прысвечанай стагоддзю Л. С. Выгоцкага / Бел. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка. Мн., 1996.
4. **Борисевич А. Р., Каленникова Т. Г.** Формирование экологического сознания учащихся как педагогическая проблема // Гуманитарное образование: фактор мировой интеграции: Матер. междунар. науч.-практ. конф. / Гос. ун-т им. Ю. Федьковича. Черновцы, 1997. С. 111—113.
5. **Вернадский В. И.** Живое вещество и биосфера / Отв. ред. А. Л. Яншин. М.: Наука, 1994.
6. **Вершловский С. Г.** Профессиональная деятельность молодого учителя. М.: Педагогика, 1982.
7. **Глазачев С. Н.** Экологическая культура учителя: Исследования и разработки экогуманитарной парадигмы. М.: Современный писатель, 1998.
8. **Дерябо С. Д., Ясвин В. А.** Экологическая педагогика и психология. Ростов н/Д: Феникс, 1996.
9. **Здравомыслов А. Г.** Проблема интереса в социологической теории. Л.: Изд-во ЛГУ, 1964.
10. **Калицкий Э. М.** На пути к открытому профессиональному образованию: ключевые квалификации. Мн.: РИПО, 1996.
11. **Калицкий Э. М.** Профессия, профессиология и профессиональное образование: методические аспекты. Мн.: РИПО, 1996.
12. **Капранова В. А.** Колледж как тип учебного заведения. Мн.: НИО, 1993.
13. **Каропа Г. Н.** Вопросы окружающей среды и устойчивого развития в современной общеобразовательной школе: Учеб. пособие. Гомель: Книга, 1998.
14. **Концепция образования и воспитания в Беларуси** / Под ред. В. П. Пархоменко. Мн.: Адукацыя і выхаванне, 1997.